УДК 821.161.3-32*А.Казлоў:398(-161.3)

*І. Р. Шпалок*

# ПЕРААСЭНСАВАННЕ ВОБРАЗАЎ БЕЛАРУСКАГА ФАЛЬКЛОРУ І МІФАЛОГІІ Ў АПАВЯДАННЯХ АНАТОЛЯ КАЗЛОВА 1990-Х ГАДОЎ

*Артыкул прысвечаны даследаванню фальклорнай і міфалагічнай асновы апавяданняў А. Казлова 1990-х гадоў са зборнікаў “Міражы ценяў” (1990.), “І тады я памёр” (1993). Аўтарам даследуюцца спосабы пераасэнсавання ўласнабеларускіх і агульнаславянскіх міфалагічных вобразаў і матываў, іх функцыі ў мастацкай структуры твора, адлюстроўваюцца прычыны іх выкарыстання.*

Выразнай адметнасцю творчасці Анатоля Казлова з’яўляецца беларуская і агульнаславянская фальклорна-міфалагічная база. Ужыванне і пераасэнсаванне беларускай дэманалогіі можна прасачыць у такіх творах, як “Адкуль з’яўляюцца яны?”, “Зацвітанне дзівасілу”, “Доўгі вечар”, “Мацвеева лазня”, якія ўвашлі ў зборнікі “Міражы ценяў” [1] і “І тады я памёр” [2]. Увогуле творы А. Казлова ранняга перыяду характарызуюцца асаблівай хуткасцю, дынамічнасцю дзеяння, якая дасягаецца праз неразвітыя сказы: “Восень. Месяц кастрычнік. Паўсонная сталіца” [1, с. 5]; або праз храналагічную непаслядоўнасць твора. Так, напрыклад, твор “Зацвітанне дзівасілу” пачынаецца з развязкі дзеяння, толькі потым падаецца завязка, далей – кульмінацыя і фінал.

Катэгорыя *іншае*, як зазначае І. Шаўлякова, “акрэслівае ўласную прысутнасць у «аб’ектыўнай рэчаіснасці» не толькі праз выключныя падзеі. Яно нібыта разлітае ў звычайнасці штодзённага існавання, танальнасць, агульны настрой якога ў ранніх аповедах А. Казлова вызначаецца чаканнем нечаканага” [3, с. 55]. Чорт – істота, пакрытая чорнай поўсцю, з рагамі і капытамі, што шкодзіць чалавеку і супрацьстаіць Богу, – у апавяданні “Зацвітанне дзівасілу” ўвасоблены ў вобразе насланага ведзьмаком злога духа, які душыць жонку галоўнага героя: “Ён на цябе насланы. Ён тваімі рукамі тваю жонку душыць. Сабе не падуладны ты” [1, с. 11]; “<...> у ноч зацвітання дзівасілу ты з нажом і чорнай курыцай стрэнешся з ім” [1, с. 14]. У гэтым выпадку аўтар метафарычна ўказвае на дрэнныя якасці і звычкі чалавека, а канкрэтна – п’янства, распусту і неадукаванасць. Я. Конеў слушна зазначае: “Героі Казлова існуюць ва ўмовах прыцемак свядомасці. Яны акружаны духоўнай цемрай, якую спараджаюць уласнымі ўчынкамі...” [4, с. 91].

Галоўны герой Сяргей з апавядання “Зацвітанне дзівасілу” звяртаецца да ведзьмака з просьбай вызваліць яго сям’ю ад злога духа, насланага па ініцыятыве Каські, з якой мужчыну яднаді любоўныя адносіны. Злы дух душыць рукамі Сяргея яго жонку Марыну. Вядзьмак Міходзька дапамагае галоўнаму герою, ведучы яго ў свяшчэнны лес да дуба-волата, які пасля ахвярапрынашэння ў выглядзе трох маленькіх боханаў хлеба дае параду: у ноч зацвітання дзівасілу з чорнай курыцай пад пахай абысці хату і ўсе яе будынкі па тры разы, а на трэці раз зрабіць нажом крыж на кожнай з дзвярэй. Пры гэтым абавязковая ўмова – устаяць на нагах. Фінал твора казачна-шчаслівы: Сяргей выконвае абрад і не падае, ён ідзе глядзець на зацвітанне дзвасілу, а хата Каські згарае.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Адным з галоўных вобразаў-сімвалаў у апавяданні з'яўляецца дрэва жыцця, або дуб-волат, якому галоўны герой і вядзьмак прыносяць ахвяру – хлеб. У беларускай міфалогіі існаваў звязаны з абагаўленнем прыроды культ дрэваў, які "выяўляе ўніверсальную канцэпцыю жыцця ва ўсіх яго праявах: нараджэнне – максімальная стадыя развіцця – смерць – новае нараджэнне" [5, с. 152]. У народнай культуры дуб лічыцца сімвалам роду, сілы, здароўя, вечнага жыцця, яго функцыямі выступаюць павелічэнне моцы чалавека, засцярога ад хвароб і ад цёмных міфічных істот.

Абрад хаджэння вакол хаты – гэта спосаб ачышчэння ад злога духа, або чорта. Сяргей абыходзіць кожны будынак свайго дома і на трэці раз адзначае крыж на ўваходзе. Такая фігура служыць абярэгам ад нячыстай сілы, пад якой метафарычна маецца на ўвазе п'янства і распуста героя. Ён выракаецца мінулых адносін з памерлай Каськай, якая спадзявалася на будучыя адносіны і жыццё з галоўным героем, а пасля вяселля Сяргея і Марыны здзейсніла самагубства.

Курыца ў беларускай міфалогіі – "увасабленне жыватворнага, пладаноснага жаночага пачатку. Праз вобраз Курыцы ў фальклорнай творчасці замяшчаецца маладая на вяселлі і наогул дзяўчына, гатовая да шлюбу..." [5, с. 270]. У апавяданні "Зацвітанне дзівасілу" гэты вобраз праецыруецца на цяперашнюю жонку галоўнага героя. Чорную курыцу традыцыйна замуроўвалі ў падмурак хаты як абярэг ад злых духаў на аснове магіі падабенства (чорны – колер д'ябла). У апавяданні такі эпізод адсутнічае, хаця астатнія часткі абраду выпісаны аўтарам даволі падрабязна. Выкананне пералічаных вышэй магічных дзеянняў увасабляе новае жыццё праведнага сем'яніна, яго нараджэнне або перараджэнне. Менавіта таму героі звяртаюцца за дапамогай да дуба-волата як касмаганічнай істоты – сімвала адраджэння. Дагавор з дрэвам ажыццяўляецца на крыві: "Палі карэнне крывёю, тады лес братам стане" [1, с. 11].

Адсылкі да ідэі "новага нараджэння" героя падаюцца пісьменнікам яшчэ ў пачатку апавядання: "І ішлі яны сцежкамі, балацявінамі і бальшаком. Начавалі пад гарэшнікам. З кожнага вялікага дрэва Міходзька адразаў галіну. І дзень ішлі, і два. Сяргей жа нёс тое голле" [1, с. 11]. Паводле славянскага культу дрэў, свяшчэнныя гаі шанаваліся, прыносіліся ахвяры пэўным дрэвам, існавала строгая забарона на прынясенне ім шкоды. Таму эпізод, дзе героі ламаюць веццё, якое потым спальваецца разам з адзежай на вогнішчы, мае глыбокі сэнс, увасабляе пераход героя ў новае жыццё. Назва твора "Зацвітанне дзівасілу" таксама сімвалізуе адраджэнне: дзівасіл – лекавая расліна, якая, паводле вераванняў, з'яўляецца гаючай, лечыць рознага кшталту хваробы і мае звышнатуральныя якасці. Такім чынам, назва і асноўныя вобразы твора ўтрымліваюць ідэю "міфалагічнага адраджэння".

Багатым на міфалагічныя вобразы з'яўляецца і апавяданне "Мацвеева лазня". Галоўны герой твора Мішка прыходзіць да сваёй каханай Любы, не застаўшы яе дома, ён чакае ля струхлелай лазні, пабудаванай ужо памерлым Мацвеем. Герой рэфлексуе і ўспамінае страшныя гісторыі, якія становяцца ўстаўнымі канструкцыямі ў кампазіцыі твора. А. Казлоў унутры апавядання падае гісторыю "Пра Кацярыну Другую і салдата", дзе жаўнер п'е гарэлку з трох келіхаў – з залатога, срэбнага, простага – і кажа, што яна з усіх келіхаў аднолькавая. У гісторыі "Пра Петрака і коней" герой заўважае, што ў яго коней заплецены косы, далей пільнуе дамавіка, які гэта робіць, і выбівае яму вока. Гісторыя "Пра Купалле і ведзьм" апісвае ведзьм, якія на свята Купалы забіваюць слабейшую з іх і п'юць яе кроў; іх здольнасці да фізічных пераўвасабленняў у жывёл, адбіранне малака ў чужых кароў. Пад раніцу, пасля спеву пеўняў, Мішка, так і не дачакаўшыся каханай, развітваецца з ёй.

Лазня, каля якой сядзіць Мішка, уяўляе сабой містычнае месца, дзе існуюць злыя духі, чэрці, лазнік. Прысутнасць апошняга ўзгадваецца ў творы праз раптоўна адчыненыя дзверы: "Рып. Хіснуліся дзверы Мацвеевай лазні" [1, с. 89]. У беларускай

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

міфалогії лазнік – гэта злы, шкодны, помслівы і агрэсіўны дух, гаспадар лазні, разнавіднасць дамашніх духаў. Як піша М. Нікіфароўскі, ён “цярпець не можа гультаёў, а тым больш – несвоечасовых наведвальнікаў, якіх пужае незвычайным храпам, шыпеннем, пайменным клічам. <…> Але ад выпуджванняў лазніка несвабодны і ўсе, хто ўздумаў бы мыцца ў лазні пасля поўначы” [6, с. 60].

Дамавік у апавяданні “Мацвеева лазня” ўзгадваецца ў гісторыі пра Петрака. Дамавік, або Хатнік, – “у беларускай міфалогіі дух хаты, цесна звязаны з уяўленнямі аб продках і гаспадарчым (асабістым) дабрабыце той ці іншай сям’і. Часцей за ўсё бачыўся старэнькім дзядком з сівой барадой і сівымі кудлатымі валасамі...” [5, с. 528], апранутым ў белую кашулю, без абутку і шапкі – прыкмета іншасвету; мог паўстаць у выглядзе змяі ці чорнага сабакі. Дамавік з’яўляецца нейтральным персанажам і, калі ён знаходзіцца ў згодзе з гаспадарамі, то дапамагае павелічэнню дабрабыту сям’і. Праз гэтую ўстаўку А. Казлоў адлюстроўвае сутнасць чалавечай няшчырасці – дамавік дапамагае, расчэсваючы коней, а чалавек адмаўляе гэтую дапамогу. Яшчэ адна ідэя, што транслюецца з дапамогай гэтага міфалагічнага вобраза, – здольнасць зла вяртацца, закон бумеранга: “Відаць выбіў ён дзядку вока, той і аддзячыў Петрака той жа капейчынай” [1, с. 40].

Пісьменнік выкарыстоўвае ў апавяданні і вобраз ведзьмы – жаночага ўвасаблення нячыстай сілы, якая мае здольнасці ператварацца ў жывёл: жабу, птушку, сароку, чорную кошку. У апошнюю істоту ператвараецца ведзьма ў дадзеным выпадку, каб забраць малако ў чужой каровы, што таксама мае карані ў беларускай міфалогіі ў вобразе “ведзьмаў малочных”. Гэта “міфічныя істоты, шкоднасць якіх палягае ў адбіранні імі ў кароў малака...” [5, с. 75]. Праз матыў фізічнай трансфармацыі ведзьмы пісьменнік даводзіць думку, што чалавек можа з’яўляцца не тым, якім здаецца на першы погляд.

У фінале апавядання з’яўляюцца вобразы чарцей у выглядзе трох вайскоўцаў, вярнуўшыхся з вайны: “<...> ва ўсіх трох вайскоўцаў хвасты, што ў валоў. Ногі ж не ў ботах, капытцы блішчаць” [1, с. 45]. У гэтай частцы твора аўтар паказвае трох жанчын у полі, якія галосяць-смуткуюць па загінуўшых на вайне мужах, просяць Бога вярнуць іх каханых, але тут жа клянуць яго, звяртаючыся да д’ябла. У адказ на такую просьбу з’яўляюцца чэрці ў выглядзе памерлых. Ад смерці жанчын ратуе ранішні спеў пеўня. Такім чынам А. Казлоў уздымае не толькі хрысціянскую праблему веры, але і паказвае адваротны бок вайны. Так, жанчыны, у час вайны кінуўшы працу ў полі, “наклікалі слязамі ды праклёнамі сілу нячыстую, падагналі смертачку сваю” [1, с. 45]. Фразу “падагналі смертачку сваю” можна прачытаць у розных сэнсах, бо смерць можа наступіць не толькі праз “нячыстую сілу”, а праз недахоп ежы, голад, бо “толькі трыма доўгімі паясамі трох гаспадароў жыта не дажата” [1, с. 44].

Як бачым, з дапамогай міфалагічных вобразаў на працягу ўсяго апавядання ўзвышаецца вобраз беларускай вёскі, яе адраджэнне разумеецца, па словах І. Шаўляковай, як “узнаўленне дзівоснай тутэйшай атлантыды” [3, с. 56], уздымаюцца маральныя, бытавыя і грамадскія праблемы, такія як няшчаснае каханне, забойства, сутнасць чалавечай дабрыні і інш. Цікава, што А. Казлоў акцэнтуе ўвагу не на станоўчых героях, а на адмоўных (галоўны герой – забойца, тры жанчыны – богазневажальніцы і г. д.). Таму галоўны герой Мішка і рэфлексуе, седзячы каля лазні – месцы існавання нячыстых сіл, таму і прыходзіць да яе, бо ён сам “нячысцік”.

Такім чынам, у сваёй ранняй творчасці А. Казлоў з дапамогай фальклорна-міфалагічных вобразаў уздымае сур’ёзныя грамадскія і маральныя праблемы: кахання, п’янства, распусты, дабрыні, веры ў Бога, асветы, адраджэння беларускай нацыі і вёскі. У апавяданнях А. Казлова выкарыстоўваюцца пераважна персанажы ніжэйшай міфалогіі, або дэманалогіі: вобразы чорта, ведзьмы, дамавіка, лазніка. Адметная роля адведзена традыцыйным раслінным вобразам (свяшчэннаму гаю, дубу-волату), якія звязваюцца з мудрасцю самога народа.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

## Літаратура

1 Казлоў, А. С. Міражы ценяў / А. С. Казлоў. – Мінск : Выдавецтва ЦК КП Беларусі, 1990. – 128 с.

2 Казлоў, А. С. І тады я памёр / А. С. Казлоў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1993. – 238 с.

3 Шаўлякова, І. Л. Сапраўдныя хронікі Поўні : артыкулы і рэцэнзіі / І. Л. Шаўлякова // Правілы адасаблення / І. Л. Шаўлякова. – Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. – С. 54–57.

4 Конеў, Я. Асноўны інстынкт / Я. Конеў // Маладосць. – 2011. – № 12. – С. 91–92.

5 Беларуская міфалогія : энцыклапедычны слоўнік. – Мінск : Беларусь, 2004. – 592 с.

6 Никифоровский, М. Я. Нечистики / М. Я. Никифоровский. – Вільня : Типо-Литография Товарищества п. ф. «Н. Мац и К°», 1907. – 103 с.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ